http://edoc.bseu.by

подавании русского языка как иностранного, и в частности в обучении научному стилю речи, данные в работе списки существительных на *-ость*, имеющих терминологическое значение (*платежеспособность, жизнедеятельность, окупаемость* и т.д.).

## Литература

1. *Виноградов В.В.* Русский язык (грамматическое учение о слове). М., 1972.

2. Грамматика русского языка. М., 1952. Ч. 1.

3. *Гвоздев А.Н.* Современный русский литературный язык. М. 1973. Ч. 1.

4. *Шанский Н.М.* О происхождении продуктивности суффикса *-ость* в русском языке // Вопр. истории рус. яз. М., 1959.

5. *Пятницкий В.Д.* Семантико-словообразовательная соотносительность качественных прилагательных и отвлеченных существительных с качественным значением в современном русском языке: Дис. ... д-ра филол. наук. М, 1968.

# ПЕДАГАГІЧНАЕ МАЙСТЭРСТВА І ПСІХАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ЯК НЕАБХОДНЫЯ ВАРУНКІ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІН У ВНУ

*С.А. Галаўко,*
*канд. філал. навук, прафесар*

Развіццё эканомікі, навукі і культуры краін свету, асабліва за апошнія гады, усё больш востра падымае праблему падрыхтоўкі спецыялістаў самага рознага профілю, колькасць і кваліфікацыя якіх гарантавала бы бесперапынны прагрэс усіх галін жыцця грамадства.

Усё больш шырокі ахоп насельніцтва адукацыяй суправаджаецца з'яўленнем новых і новых галін ведаў, што, у сваю чаргу, уплывае на неабходнасць перыядычнай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі спецыялістаў і, у тым ліку эканамічнага профілю.

У сучасных умовах выпускнікі сярэдніх навучальных установў за перыяд навучання ў школе павінны валодаць неабходнымі ведамі асноў навук, працоўнымі навыкамі і наблізіцца да канкрэтнай прафесіі. Усё гэта ставіць перад школай новыя праблемы, выхаваўчыя функцыі якіх бесперапынна павялічваюцца і ўмацоўваюцца. Вось чаму педагагічная думка павінна быць накіраванай на распрацоўку комплекснага падыходу да выха-

вання ўсёй моладзі, у тым ліку, і студэнтаў. А.С. Макаранка, у свой час, таксама падкрэсліваў тое, што чалавека выхоўваць па частках нельга. Менавіта ў гэтым і стаіць пытанне ў тым, што комплексны падыход памагае выпрацаваць сістэму выхавання, падняць яе на больш высокую якасную ступень.

Што ж тут патрэбна, калі справа ідзе аб структуры вышэйшай адукацыі, якая сёння ўключае дзве ступені. Першая павінна забяспечыць атрыманне адпаведнай прафесійнай кваліфікацыі, другая забяспечвае атрыманне адпаведнай вышэйшай адукацыі і дае права займаць пасаду пераважна ў галіне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, ліцэях, гімназіях, арганізацыях дзяржаўнага ўпраўлення і на кіруючых пасадах.

Што датычыць пытання глабальнага, дык дазвольце мне выказаць наступнае: перш за ўсё трэба весці размову аб культуры. Без ягонай не можа адбыцца ніякае паляпшэнне ў жыцці ніводнай нацыі. Пакуль культура, а гэта не толькі мастацтва, не толькі спевы альбо танцы, дэкламацыя і акрабатыка на ступеньках тэатраў, дамоў культуры, дамоў адпачынку, гэта больш шырэй, і, у першую чаргу, гэта АДУКАЦЫЯ, гэта псіхалогія, гэта педагагічная навука. Без гэтай навукі ні грамадства, ні, тым больш, навучальныя ўстановы не змогуць несці ў асяроддзе любога напрамку, асабліва ў асяроддзе нашай моладзі, якая хоча ведаць многае і ў школе, і ў нашым універсітэце, тыя веды, якія выпрацоўваліся чалавецтвам на працягу стагоддзяў. І гэта не банальныя словы, не банальная размова. Гэта ісціна, якая падцверджана жыццём многіх краін. Там, дзе культуры прыдаецца асаблівая ўвага, там і жыццё асаблівае, больш прыгожае, больш багатае як у сэнсе маральным, так і матэрыяльным. А педагогіка не можа існаваць асабіста ад культуры. І вось тут, на наш погляд, трэба спыніцца і выказаць думку наконт педагагічнай навукі, якая нам вельмі патрэбна ва ўсіх навучальных установах, у тым ліку і ў нашым універсітэце.

Справа ў тым, што вялікая колькасць нашых выкладчыкаў атрымала прафесійную эканамічную адукацыю і выкладаюць навуку так, як, на іх погляд, трэба яе выкладаць. Гэта ўсё правільна. Гэта вельмі добра, калі выкладчык умее абараніць свае пазіцыі, калі ён лічыць, што менавіта так, а не інакш павінен прачытаць, расказаць пра тое, што ён сёння выкладае. Але не ва ўсіх атрымоўваецца station ўча. Чаму? Таму што многія, стаўшы кандыдатамі навук, заняўшы прафесарскія пасады, не звяртаюць увагу на педагагічнае майстэрства, да якога сённяшнія выпускнікі нават сярэдніх школ, папаўшы на лекцыю прафесара вышэйшай навучальнай установы, бачаць недахопы, лічаць яе нецікавай, прымітыўнай. Гэтыя разважанні мне не ад-

нойчы даводзілася чуць ад нашых студэнтаў, якія скардзіліся на нецікавыя, абыякавыя лекцыі, чытаемыя пры дапамозе канспекта, альбо і без яго, але сумна выкладаемыя на працягу гадоў. Выснова? Ёсць і выснова. Калі ты выкладчык, ты павінен атрымоўваць педагагічную і псіхалагічную падрыхтоўку. Тады, дазвольце вас запэўніць, і будзе рух уперад.

У сувязі з вышэйвыказаным, мне здаецца, што кожны выкладчык любой дысцыпліны, лектар, прафесар, доктар навук павінен умець весці размову не толькі пра тое, колькі будзе «два» і «два», а і пра тое, што нашае жыццё складаецца з розных кампанентаў асобнай, а можа і не асобнай справы, якую мы выкладаем. Што ж тут маецца на ўвазе? Калі выкладчыку не адступіць у час лекцыі ад той праблемы, якую ён выкладае, то ён будзе «сухім» выкладчыкам! Бо яго манатоннае гучанне, яго чытанне і бесперапынны паўтор аднолькавых слоў і выразаў, сказаў і нават прыкладаў, даводзяць да таго, што студэнты спяць на занятках. І, нават больш таго, не прыходзяць на лекцыі. Вось чаму трэба абавязкова гаварыць аб педагагічным майстэрстве.

А як разумець «педагагічнае майстэрства»? Тут павінен быць альбо незвычайны талент у выкладчыка, альбо самая моцная педагагічная падрыхтоўка. Такім чынам, стаіць пытанне, што рабіць? Павысіць майстэрства! Але за кошт чаго? Ці, магчыма, знайсці нешта іншае? На гэтыя пытанні можа адказаць толькі час. Менавіта, толькі ён прыводзіць да патрэбнай высновы (маецца на ўвазе стаж, вопыт).

І тым не менш, калі чалавек працуе, калі ён хоча працаваць і далей, неабходна «варушыцца», неабходна шукаць і знаходзіць! Сёння нялёгка рабіць падобнае. Таму што амаль ужо ўсё даўно знойдзена. Але ж гэта не так! Калі сістэматычна праглядваць і ранейшыя, і новыя напрамкі той ці іншай дысцыпліны, мы заўсёды знойдзем падказку аб тым, што трэба рабіць, як ажывіць, як больш цікава перадаць веды, якія выпрацавала чалавецтва. У кожнага выкладчыка маладога і, тым больш, з вялікім вопытам, знойдуцца прыклады, якія дапамагаюць заняткі зрабіць цікавымі, змястоўнымі, пазнавальнымі і патрэбнымі не толькі для агульнай адукацыі, агульнага развіцця, але і для будучай прафесійнай дзейнасці. Бо яскравыя прыклады, якія маюць месца, альбо выдуманыя і вобразна пададзеныя, заўсёды знойдуць разуменне ў аўдыторыі — будзь гэта студэнты ці другая катэгорыя слухачоў.

Вядома, не кожны мае нейкія асаблівыя здольнасці. Але ўпэўнен, у кожнага выкладчыка ёсць пра што расказаць са свайго, альбо і не са свайго жыцця. І гэтым трэба карыстацца!

На жаль, нярэдка мы падыходзім фармальна да выкладання сваёй дысцыпліны. Адны заняткі мала чым адрозніваюцца ад другіх, з'яўляюцца сумнымі, не носяць творчага характару і тым самым параджаюць у студэнтаў скептыцызм да патрэбнасці яе вывучэння. Бывае і так. Паступіўшы ва універсітэт з нядрэннай падрыхтоўкай, студэнт губляе і тыя веды, якія ён атрымаў у школе. Вось чаму мы абавязаны ўмець працай у групах прывіваць веды і любоў да выкладаемага прадмета. Галоўная задача выкладчыка ў тым, каб заставіць студэнта прымаць удзел у рабоце ўсёй групы. Але ёсць студэнты, якія адчуваюць сябе больш слабымі, чым некаторыя іх калегі, саромеюцца прымаць удзел у дыскусіях, таму што баяцца зрабіць памылкі. У гэтым выпадку такт выкладчыка можа адыграць рашаючую ролю ў дальнейшым поспеху навучэння. Тут вельмі важна не адбіць ахвоту ў таго студэнта, у якога ёсць станоўчая матывацыя да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Безумоўна, дрэнны той выкладчык, які бесперапынна выклікае ў студэнта адмоўныя эмоцыі. У гэтым выпадку ніякая матывацыя не зможа надхніць студэнта на вывучэнне вамі любімай дысцыпліны.

Трэба адзначыць, што характэрным з'яўляецца наступны адмоўны стэрэатып у дзейнасці выкладчыкаў: а) прывычны і заўсёды аднолькавы падыход да ізлажэння матэрыяла і да яго выкладання ўвогуле, г.зн. работа па шаблону; б) на занятках перавага ўласнай актыўнасці на шкоду студэнцкай, г.зн. жаданне ўсё яшчэ раз расказаць, растлумачыць, паўтарыць; в) сувязь ацэнкі асобы з яго паспяховасцю, калі яму гавораць, што ён ні на што не здольны; г) дзейнасць, якая можа закончыцца канфліктам са студэнтам, які, на думку выкладчыка, павінен быць «ніжэй травы, цішэй вады», а то і можа аказацца злейшым яго ворагам. Вось тут трэба арганізоўваць не паводзіны, а дзейнасць студэнта.

І праўда, калі табе бесперапынна гавораць адно і тое ж, калі ні разу не пачуеш добрага слова, то гэтым самым адбіваецца ўсякая ахвота да вывучання гэтай дысцыпліны. Студэнт расчароўваецца як у вывучэнні выкладаемай дысцыпліны, так і ў выкладчыку. Такім чынам, як мы бачым, галоўная фігура ў навучальным працэсе — гэта выкладчык. Менавіта ад яго, яго эрудыцыі і педагагічнага майстэрства залежыць якасць ведаў студэнта. Каб навучаць на сучасным узроўні, неабходна навучаючы самому вучыцца.

Той выкладчык, які цікавіцца толькі фармальным выкананнем сваіх абавязкаў, гэта значыць штодзённа прыходзіць на службу, не спазняецца, але і не затрымліваецца пасля праведзенных заняткаў, не можа ўдасканальвацца, майстэрскі пера-

даваць свае веды навучэнцам. І наадварот, той, хто займаецца ўсебаковай рознастайнай дзейнасцю, актыўна ўдзельнічае ў навукова-даследчай, навукова-метадычнай, грамадскай рабоце, значна цікавей вядзе заняткі ў студэнтскай аудыторыі. Ён сваімі багатымі ведамі, сваім вопытам робіць выкладаемую дысцыпліну цікавай, жывой, творчай.

Сёння так званыя актыўныя метады складаюць ядро апошніх метадычных дасягненняў. У працэсе навучання паспяхова ўжываюцца такія методыкі выкладання, як праблемнае, праграмнае навучанне, інтэнсіўны метад, ігравое мадэліраванне і г.д. Дазвольце выказаць некалькі слоў менавіта пра гэтыя напрамкі: праблемнае навучанне — гэта развіццё і фарміраванне творчага мыслення пры вывучэнні той ці іншай дысцыпліны. А для гэтага галоўным з'яўляецца тое, як выкладчык умее стварыць праблемныя сітуацыі, якія павінны быць самым моцным матывам для засваення новага вучэбнага матэрыялу.

Інтэнсіўнае навучанне тычыцца развіцця навыкаў і уменняў ва ўзаемных зносінах, што павінна засноўвацца на псіхалагічных асновах асобы студэнта і калектыву.

Праграмнае навучанне — гэта аптымізацыя пры дапамозе тэхнічных сродкаў кіраваць навучальным працэсам.

Асаблівая ўвага сёння адводзіцца іграваму навучанню па ралям, дзе кожны ўдзельнік павінен упэўнена і дасканальна валодаць сваёй «пасадай» пры выкананні сваіх абавязкаў. У гэтым сэнсе такая методыка павінна засноўвацца на мастацкіх здольнасцях і выкладчыка, і студэнтаў.

Але як бы інтэнсіўна не выкарыстоўваліся ўсе гэтыя новыя і не новыя напрамкі, падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, галоўным фактам рэалізацыі гэтых мэт і задач застаецца выкладчык.

Нельга звязваць ацэнку паводзін і вынікі дзейнасці студэнтаў з ацэнкай іх асобы. Калі выкладчык дае негатыўную ацэнку асобы студэнта, ды і яшчэ ў прысутнасці яго аднакурснікаў, выхаваўчы эффект на гэтым заканчваецца. Студэнт у далейшым не ўспрымае нават самыя добрыя і карысныя парады. Ацэнка асобы — справа не простая, і калі мы гэтым не валодаем, лепш не старацца гэта рабіць.

Сёння ўмовы жыцця і працы на вытворчасці, маральная і матэрыяльная зацікаўленасць павінны выпрацоўваць у выкладчыка сумеснасць патрабаванняў да навукова-метадычнай работы, педагагічнага майстэрства. У выкладчыка павінна выпрацоўвацца чалавечнасць, заботлівасць, разуменне таго, што ў яго руках знаходзіцца лёс чалавека, што ў прыгожым выхаванні выхаваўцаў, у самавыхаванні стан таго, што выклад-

чык перанясе ўсе гэтыя якасці на выхоўваемага. Менавіта па-гэтаму прафесія выкладчыка па сваёй сутнасці абавязвае яго быць чалавекам высокай культуры, творчых адносін да працы, да сваіх паводзін і г.д.

Як выкладчык замежнай мовы не магу не спыніцца яшчэ на адным аспекце выкладання, а лепш сказаць — навучання студэнтаў: на так званай самаадукацыі, самастойнай рабоце. На наш погляд, важнае месца павінна займаць на працягу навучання ў сённяшняй ВНУ самастойная работа студэнта пры авалоданні замежнай мовай. Справа ў тым, што рана ці позна замежная мова як і ў заходніх краінах будзе вывучацца не на абавязковых курсах ВНУ, а самастойна і персанальна, з рэпетытарам, з сябрам, гувернёрам і г.д. І на гэта дзяржава грошы не будзе траціць. Гэтыя грошы краіна будзе аддаваць толькі на аплату выкладчыка-экзаменатара. У сувязі з гэтым ужо на сённяшнім этапе вучобы ў ВНУ трэба навучаць студэнтаў самастойнай рабоце і не толькі замежнай мове. Дык што ж тут маецца на ўвазе?

Як мы ведаем самастойная работа не толькі вучэбная задача, але і дзяржаўная, палітычная і грамадская справа падрыхтоўкі спецыяліста па-новаму. Таму ўсё заключаецца ў тым, каб навучыць студэнта вучыцца самастойна, працаваць самастойна ў яго будучай прафесійнай дзейнасці. Самастойная работа — спецыфічная форма падрыхтоўкі, якая залежыць ад спецыфічных пераходаў да асабістых адносін пры вывучэнні той ці іншай дысцыпліны. Навучыцца працаваць самастойна — гэта значыць:

1) усвядоміць мэту сваёй дзейнасці;

2) паставіць вучэбную задачу для атрымання гэтай мэты;

3) надаць ёй асабовы сэнс;

4) для дасягнення гэтай мэты падпарадкаваць усе іншыя інтарэсы;

5) вызначыць пастаянны час работы;

6) умець сябе кантраляваць пры выкананні гэтай задачы.

Адной з перспектыўных форм вырашэння праблемы інтэнсіфікацыі працэса навучання замежнай мове і арганізацыі самастойнай работы студэнтаў з'ўляецца шырокае выкарыстанне камп'ютэрнай тэхнікі, асабліва на старэйшых курсах, якая дазваляе стварыць аптымальныя ўмовы для аператыўнага кіравання вучэбнай дзейнасцю навучэнцаў, дапамагае эфектыўна весці самакантроль і самакарэкцыю вучэбных дзеянняў, стварае добрыя ўмовы для розных рэжымаў працы студэнтаў, а таксама для рэалізацыі і дыферанцыраванага падыходу пры навучанні.

Такім чынам, самастойная работа — гэта арганізуемая, выконваемая ў перыяд найбольш рацыянальнага з пункту гледжання самога студэнта час, кантралюемая ім самім уся дзейнасць на аснове сістэмнага кіравання гэтай дзейнасцю з боку вучэбнага матэрыялу, дысплейнай тэхнікі і з боку выкладчыка.

Асноўныя праблемы, з якімі сустракаюцца студэнты пры арганізацыі самастойнай работы, гэта няўменне слухаць матэрыял, чытаць, выдзяляць галоўнае, арганізаваць свой час. Здольнасць да самастойнай работы эфектыўней у тых, у каго станоўчая матывацыя да пазнавальнай дзейнасці. Вось чаму ўсяму гэтаму выкладчык павінен навучыць будучых спецыялістаў умець працаваць самастойна.

І яшчэ! На вывучэнне замежных моў не трэба глядзець, як на выключна практычную дзейнасць, лічыць яго дысцыплінай прафесійнай адукацыі. Ёсць і другая, больш універсальная прычына, якая матывіруе гэтае навучэнне. Валоданне замежнымі мовамі адкрывае нам вочы на жыццё іншых народаў, памагае правільна разумець іх псіхалагічныя і характэрныя рысы. Жыхары іншых краін, мову якіх мы разумеем, становяцца для нас больш блізкімі, больш сімпатычнымі. І усё гэта таму, што разуменне мовы нам дазваляе ўбачыць тое, без ведання якой мы не заўважаем у размаўляючых на ёй людзей. Гаворачы пра гэта ў шырокім сэнсе, вывучэнне замежных моў служыць справе міжнароднага ўзаемаразумення і ўмацавання міру.

Вывучэнне замежнай мовы (як некаторыя думаюць) быццам бы з'яўляецца вельмі складанай праблемай. Гэта не так! Вывучэнне замежнай мовы не з'яўляецца складанай праблемай ні з якога пункту гледжання, а тым больш для славянскіх народаў. Чаму славянскіх? таму што ў славянскіх мовах маюцца амаль усе фанетычныя гукі ўсіх еўрапейскіх моў. Менавіта па-гэтаму вымаўленчыя навыкі зусім не складаныя. Але ж ведаць, вывучыць замежную мову гэта прыкладна тое самае, што навучыцца іграць на якім-небудзь музычным інструменце, напрыклад, на фартэпіяна. Бо калі не музыцыраваць па некалькі гадзін у дзень, музыкант не атрымаецца. Тое ж самае можна сказаць і аб замежнай мове. Калі штодзённа ёй не аддаваць увагу — добрага выніка не атрымаецца. Таму, як і ўсякая справа, вывучэнне замежнай мовы патрабуе ўвагі і сістэматычнай працы.

Вялікае значэнне ў фарміраванні спецыялістаў іграе мэтанакіраваная палітыка — выхаваўчая падрыхтоўка моладзі. У комплексе гэтай работы адным з вядучых напрамкаў служыць эстэтычнае выхаванне, павышэнне культурнага ўзроўню, пры-

віванне густаў і навыкаў да мастацкай творчасці. У гэтым сэнсе важнае значэнне мае ўдзел студэнтаў і выкладчыкаў у развіцці мастацкай самадзейнасці. І тут уласны прыклад выкладчыкаў іграе выключную мабілізуючую ролю ў справе развіцця іх эстэтычных якасцяў. Бо для фарміравання свядомасці маладога спецыяліста важна не толькі колькасць даваемых выкладчыкам прафесійных ведаў, але і тое, як гэта робіцца. Гэта значыць, калі ў чытанні курса праяўляецца адукаванасць і інтэлігентнасць кожнага яго слова. Карацей кажучы, фактар асобы выкладчыка іграе вельмі значную ролю, калі не рашаючую ў фармаванні будучага спецыяліста. І наогул, чым вышэй культура выкладчыка, чым больш яго навуковы, грамадскі аўтарытэт, тым мацнейшы яго ўплыў на выхоўваемага. І гэты ўплыў можа мець уздзеянне не толькі з таго моманта, калі выкладчык зайшоў у айдыторыю і пачаў чытаць лекцыю альбо праводзіць практычныя заняткі. Гэты ўплыў можа атрымацца задоўга да чытаемага курса. У гэтым сэнсе, на наш погляд, павучальным з'яўляецца вопыт нашага універсітэту, яго народны мужчынскі вакальны ансамбль прафесараў і дацэнтаў, які ў наступным годзе будзе адзначаць свой трыдцацігадовы юбілей. Мы лічым, што на сучасным этапе зусім недастаткова рыхтаваць толькі прафесійна кваліфікаваных спецыялістаў, але і ўмець вучыць вучыцца. Дзейнасць выкладчыка павінна быць шырэй, больш усеабдымнай і рознабаковай. Больш таго, удзел выкладчыкаў у вакальна-харавых спевах садзейнічае не толькі актыўнаму правядзенню вольнага часу, але і ўдасканаляннню педагагічнага майстэрства, адточванню галасавых і моўных даных, яго прамоўніцкага мастацтва, так неабходных сучаснаму кваліфікаванаму лектару.

Амаль усе выкладчыкі нашага Народнага мужчынскага вакальнага ансамбля «Чырвоны гваздзік» чытаюць курс спецыяльных дысцыплін. І канешне ж, калі яны ўваходзяць у студэнцкую аўдыторыю чытаць лекцыю, слухачы іх ужо ведаюць. Ведаюць як выкладчыкаў, як навукоўцаў і як артыстаў з народу. Вось чаму яшчэ з большай увагай і зацікаўленасцю студэнты слухаюць іх лекцыі, актыўны на семінарах, практычных занятках.

Пабыўшы аднойчы на канцэрце, у якім прымаў удзел «Чырвоны гваздзік», студэнты з асаблівай павагай адносяцца да аўтарытэту яго ўдзельнікаў, да энтузіястаў-выкладчыкаў, якія і без таго загружаны сваімі непасрэднымі прафесійнымі абавязкамі, аддаюць свой вольны час рэпетыцыям, рабоце над песняй, канцэртам. Выкладчыкі не былі б выкладчыкамі, калі б не цягнуліся да таго, што не ведае шырокая аўдыторыя слухачоў.

Мы жывём у такі час, калі кожны чалавек павінен дасканальна на высокім узроўні выконваць свае абавязкі, быць прыкладам у жыцці і дзейнасці, карацей кажучы — прыкладам выканання грамадскіх даручэнняў, паводзін ва ўстанове і па за ёй. На наш погляд, мы выконваем задачы не толькі прапагандыста народнай, патрыятычнай, лірычнай, жартоўнай песні, якімі багаты наш народ, яго фальклёр. Мы лічым, што эфектыўнае вырашэнне пытанняў ідэйнага і эстэтычнага выхавання студэнтаў і моладзі ўвогуле — справа грамадская, а калі для гэтага ёсць талент і неабходныя ўмовы, дык патрэбна іх сістэматычна развіваць, удасканальваць і сваімі выступленнямі ўзбагачаць духоўную культуру людзей.

### Літаратура


1. *Мишкевич М.В., Попок Н.В.* Проблемы преподавания иностранных языков в неязыковом вузе. Мн., 1999.

2. *Федоров А.М.* Нужна ли психология преподавателям иностранных языков? Мн., 1999.

3. *Васильева О.В.* Информационная телесистема вуза и интегрированное средство обучения иностранному языку. Мн., 1999.

4. *Лукина М.М.* Интенсификация самостоятельной работы студентов по овладению чтениям. Мн., 1999.

5. Самостоятельная работа студентов и изучение иностранного языка // Материалы заседаний секций эксперим. исслед. при Минвузе СССР. М., 1988.


## ТЕСТОВЫЙ КОНТРОЛЬ ЗНАНИЙ СТУДЕНТОВ В СИСТЕМЕ ОЦЕНКИ КАЧЕСТВА ОБУЧЕНИЯ


*С.П. Гурко, профессор,*

*А.М. Зеневич, старший преподаватель,*

*А.Н. Морозевич, д-р техн. наук, профессор*


Первейшая задача образовательной политики на современном этапе — достижение современного качества образования, его соответствие актуальным и перспективным потребностям личности, общества и государства. Сегодня уже совершенно ясно, что решение проблемы улучшения качества, повышения активности и обеспечение индивидуализации обучения в высшей школе достижимо лишь на основе целенаправленного органического применения новых информационных технологий (НИТ) при осуществлении вузовского образования. Необходимо учи-